Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
______________ Н. У. Карчэўская
«___» _____________ 2018 г.

# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВАЎ

*Праграма дзяржаўнага экзамену*
*па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства*
*(інтэграванае), спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01*
*Кампаратыўнае мастацтвазнаўства*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

2018

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*В. П. Пракапцова,* загадчык кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», доктар мастацтвазнаўства, прафесар;
*А. М. Шаройка,* дацэнт кафедры беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*Р. Б. Смольскі,* загадчык навукова-даследчага аддзела ўстановы адукацыі «Беларуская дзяржаўная акадэмія мастацтваў», доктар мастацтвазнаўства, прафесар;
*Н. У. Карчэўская,* дэкан факультэта традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў», кандыдат мастацтвазнаўства, дацэнт

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* беларускай і сусветнай мастацкай культуры ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 14 ад 17.04.2017);
*саветам* факультэта культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 7 ад 29.03.2017);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў» (пратакол № 4 ад 20.04.2017)

Адказны за рэдакцыю: В. Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А. М. Шаройка

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Дзяржаўны экзамен «Тэорыя і гісторыя мастацтваў» праводзіцца згодна адукацыйнаму стандарту вышэйшай адукацыі ОСВО 1-21 04 02-2013 па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства. Праграма дзяржаўнага экзамену прызначана для вызначэння аб'ёму і зместу ведаў выпускнікамі спецыялізацыі 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае).

У змест праграмы ўключаны базавыя тэарэтычныя пытанні вучэбных дысцыплін, якія выкладаліся на працягу навучання ва ўніверсітэце: «Гісторыя мастацтваў», «Мастацтвазнаўчы семінар», «Сусветны і беларускі музычны тэатр», а таксама «Тэорыя і гісторыя мастацтваў», «Мастацтва XX ст.», «Гісторыя сусветнай мастацка-матэрыяльнай культуры: ад вытокаў да XX ст.», «Гісторыя мастацкай крытыкі і мастацтвазнаўства», «Кампаратывістыка ў мастацтвазнаўстве».

Праграма адлюстроўвае ўнутраную логіку вывучаемых метадычных праблем, арыентуе будучых спецыялістаў на дзейнасць па авалоданні сучаснымі тэхналогіямі навучання і выхавання.

*Мэтай* дзяржаўнага экзамену па «Тэорыі і гісторыі мастацтваў» з'яўляецца высвятленне сфарміраванасці ў студэнтаў трывалых навыкаў і ўменняў, якія неабходны для рацыянальнай арганізацыі выкладання мастацтвазнаўчых дысцыплін як вучэбнага прадмета, а таксама для паспяховага вырашэння навукова-даследчых задач у сферы мастацтва.

Для рэалізацыі мэты прадугледжваецца вырашэнне наступных *задач:*

– высвятленне наяўнасці ў выпускнікоў сістэмы ведаў па тэорыі і гісторыі мастацтва;

– выяўленне ступені авалодання ўсеагульнымі заканамернасцямі функцыянавання мастацтва;

– вызначэнне ўзроўню асэнсаванасці выпускнікамі сутнасці відаў мастацтва і заканамернасцей іх дынамікі, унікальнага вопыту ўзаемадзеяння і сінтэзу відаў і жанраў мастацтва, што асабліва важна на сучасным этапе;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– высвятленне грунтоўнасці ведаў па праблемах тэорыі і гісторыі мастацтва, гісторыі мастацкай крытыкі і мастацтвазнаўства;

– высвятленне ступені сфарміраванасці ў студэнтаў навуковага падыходу да вывучэння з'яў мастацтва, які грунтуецца на авалоданні імі сучаснымі метадалагічнымі падыходамі.

Для вырашэння задач выпускнік павінен *ведаць:*

– важнейшыя метадалагічныя парадыгмы, прынцыпы і метады мастацтва, якія забяспечваюць разуменне яго як інтэгратыўнай сістэмы;

– асноўныя заканамернасці культурна-гістарычнага развіцця чалавецтва;

– сэнс і сутнасць базавых сімвалаў сусветнага і нацыянальнага мастацтва;

– асноўныя этапы развіцця мастацтва ў сувязі з сусветнай гісторыяй чалавецтва;

– асноўныя мастацкія дасягненні пэўных геаграфічных рэгіёнаў і народаў;

– асноўныя артэфакты мастацтва, створаныя геніямі чалавецтва.

У працэсе дзяржаўнага экзамену выпускнікі павінны паказаць навыкі і ўменні, якія неабходны для:

– ацэньвання стану, тэндэнцый і перспектыў развіцця сучаснага мастацтва;

– крытычнага ўспрымання разнастайных з'яў мастацтва ў іх суаднесенасці з іншымі сферамі сацыяльнай жыццядзейнасці;

– выяўлення сувязі мастацтва з рэлігійнымі, філасофскімі пошукамі, дасягненнямі навукі і адукацыі;

– асэнсавання значэння мастацтва як індыкатара стану грамадства;

– аналізу артэфактаў мастацтва з семіятычнага, аксіялагічнага пунктаў гледжання;

– даследавання твораў класічнага і масавага мастацтва.

Выпускнік павінен валодаць наступнымі акадэмічнымі кампетэнцыямі:

АК-1. Умець выкарыстоўваць базавыя веды ў галіне гуманітарных і сацыяльна-эканамічных навук для вырашэння прафесійных задач у галіне мастацтвазнаўства.

АК-2. Валодаць культурай мыслення.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

АК-3. Валодаць даследчыцкімі навыкамі.

АК-4. Умець працаваць самастойна.

АК-5. Быць здольным да творчай, крэатыўнай работы.

АК-6. Валодаць міждысцыплінарным падыходам да вырашэння праблем.

АК-8. Валодаць навыкамі вуснай і пісьмовай камунікацыі.

АК-11. Свабодна выкарыстоўваць прафесійную тэрміналогію.

АК-12. Уяўляць сучасную карціну свету на падставе цэласнай сістэмы гуманітарных ведаў, арыентавацца ў каштоўнасцях быцця, жыцця, культуры.

АК-13. Валодаць інфармацыяй у галіне гістарычных ведаў, разумець сілы і заканамернасці гістарычнага працэсу для ўзбагачэння зместу сваёй даследчыцкай, мастацка-творчай і педагагічнай дзейнасці.

АК-14. Разумець і аналізаваць светапоглядныя, сацыяльна і асобасна-значныя філасофскія праблемы.

АК-17. Знаць гісторыю і тэорыю мастацтваў у межах акадэмічных праграм і выкарыстоўваць гэтыя веды ў сваёй прафесійнай дзейнасці.

АК-18. Умець бачыць і інтэрпрэтаваць факты, падзеі, з’явы сферы прафесійнай дзейнасці ў шырокім гістарычным і культурным кантэксце.

АК-19. Арыентавацца ў спецыфічных актуальных працэсах, якія адбываюцца ў сучасным мастацтве.

Таксама выпускнік абавязаны валодаць наступнымі сацыяльна-асобаснымі кампетэнцыямі:

САК-1. Усведамляць грамадзянскі доўг, валодаць развітым пачуццём патрыятызму, ведаць правы і выконваць абавязкі грамадзяніна.

САК-2. Быць здольным да сацыяльнага ўзаемадзеяння.

САК-3. Валодаць здольнасцю да міжасобасных камунікацый.

САК-5. Быць здольным да крытыкі і самакрытыкі.

САК-6. Умець працаваць у калектыве.

САК-7. Фарміраваць і аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

САК-8. Уважліва і ашчадна ставіцца да гістарычнай спадчыны і культурных традыцый, талерантна ўспрымаць сацыяльныя і культурныя адрозненні.

Акрамя вышэйпералічанага, выпускнік павінен валодаць наступнымі прафесійнымі кампетэнцыямі.

*Навукова-даследчыцкая дзейнасць*

ПК-1. Кваліфікавана праводзіць навуковыя даследаванні па выяўленні, апісанні, аналізе, рэцэнзаванні твораў мастацтва.

ПК-2. Ведаць прынцыпы і прыёмы збору, сістэматызацыі, абагульнення і выкарыстання інфармацыі для правядзення навуковых даследаванняў у дакладных галінах мастацтва.

ПК-3. Забяспечваць практычную значнасць праведзеных навуковых даследаванняў.

Спецыяліст па напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства (інтэграванае), акрамя таго, павінен быць здольным:

*Педагагічная дзейнасць*

ПК-4. Выкладаць мастацтвазнаўчыя дысцыпліны на сучасным навукова-тэарэтычным і метадычным узроўнях.

ПК-6. Засвойваць і ўкараняць сучасныя адукацыйныя тэхналогіі і педагагічныя інавацыі.

ПК-14. Распрацоўваць і выкарыстоўваць сучаснае вучэбна-метадычнае забеспячэнне.

*Аналітычная дзейнасць*

ПК-10. Дыялектычна мысліць і аргументаваць свой пункт гледжання, аналізаваць факты і прагназаваць развіццё падзей.

ПК-11. Аналізаваць сучасны стан і перспектывы развіцця мастацтва.

Склад пытанняў у праграме вызначаны з мэтай аб’ектыўнай ацэнкі ведаў і якасці падрыхтоўкі па названай спецыялізацыі і прыняцця рашэння дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіяй аб прысваенні кваліфікацыі.

Па кожным пытанні прыводзяцца тлумачэнні, мэтай якіх з’яўляецца ўдакладненне зместу пытання, якія б спрыялі эфектыўнай падрыхтоўцы да здачы экзамену.

У склад праграмы ўключаны спіс літаратуры, які прызначаны для самападрыхтоўкі студэнтаў да здачы дзяржаўнага экзамену.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Дзяржаўны экзамен праводзіцца ў пісьмова-вуснай форме і прадугледжвае падрыхтоўку разгорнутага адказу на два тэарэтычных пытання па асноўных раздзелах навучальных дысцыплін, вынесеных на экзамен.

Пры адказе на дзяржаўным экзамене выпускнік павінен прадэманстраваць добрае валоданне прафесійнай лексікай, самастойнасць мыслення, уменне аргументаваць уласныя меркаванні і прафесійную пазіцыю, уменне выкарыстоўваць базавыя веды для вырашэння задач.

Узровень падрыхтоўкі ацэньвае дзяржаўная экзаменацыйная камісія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ДЗЯРЖАЎНАГА ЭКЗАМЕНУ

## Раздзел 1. Тэорыя мастацтва

Мастацтва як мова. Мастацтва ў шэрагу іншых знакавых сістэм. Мастацтва як сродак камунікацыі. Натуральныя мовы. Штучныя мовы. Другародныя мовы. Мастацтва – другародная мадэлюючая сістэма, твор – тэкст на мове мастацтва. Змястоўнасць формы твора.

Структура мастацкага тэксту. Парадыгматычная вось значэнняў. Паняцце тэксту. Прыкметы тэксту: выразнасць, абмежаванасць, структурнасць. Іерархічнасць тэксту. Канструктыўнасць тэксту. Пабудова мастацкага тэксту па двух тыпах суадносін: супрацьпастаўленне паўторных элементаў і супрацьпастаўленне суседніх элементаў. Паўторнасць, якая раўназначна эквівалентнасці.

Кампазіцыя твора. Праблема мастацкай прасторы і часу. Кампазіцыя як сінтагматычная арганізаванасць сюжэтных элементаў. Рамка як мяжа, якая аддзяляе мастацкі тэкст ад немастацкага. Рама карціны, рампа ў тэатры, пачатак і канец літаратурнага або музычнага твора, паверхні скульптуры і архітэктурнага збудавання. Мастацкі твор як абмежаваная прастора. Формы эстэтычнага дуалізму ў розных відах мастацтва. Часовыя мастацтвы. Нераўнамернасць, здольнасць да сціскання, расцягвання, пераходу з сучаснага да розных форм мінулага мастацкага часу ў кінематографе. Час і жанр твора.

Сюжэт, персанаж і характар у мастацкім творы. Фабула і сюжэт у мастацкім творы. Матыў. Падзея ў мастацкім тэксце як перамяшчэнне персанажа праз семантычнае поле. Падзея і час у творы. Персанаж як перасячэнне структурных функцый. Асноўныя функцыі: герой, памочнік, шкоднік. Элементы сюжэта – семантычнае поле, падзеленае на дзве ўзаемаспалучаныя часткі; непераадольная мяжа паміж імі, дасяжная толькі герою. Характар – сутнасць чалавека, як некаторая адзіная магчымая норма паводзін у мастацкім тэксце, ажыццяўляемая як пэўны набор варыянтаў, часткова рэалізаваных у яго памерах. Нечаканасць паводзін героя як парадыгма.

Сістэма экраннага мастацтва. Кіно, тэлебачанне, дыгітальнае мастацтва. Тэхнагенная прырода. Спецыфіка аўдыявізуальнага

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

аповеду. Камунікатыўна-эстэтычны патэнцыял вобразнай сістэмы.

Кіно як від экраннага мастацтва. Кадр як аснова кінамовы. Рух як аснова кінавобразнасці. Выразныя сродкі, відавая тыпалогія і сістэма жанраў кінамастацтва.

Тэлебачанне як від экраннага мастацтва. Прасторава-часавы кантынуум тэлевізійнага артэфакта. Інтэрактыўнасць. Праграмнасць, цыклічнасць, рэпартажнасць як базавыя прынцыпы экраннага вобраза на тэлебачанні.

Прырода экраннага аповеду. Семіётыка сцэны. Кіно як відавая (выява) і слыхавая (музыка, слова) рухавая вобразнасць. Ланцужковая паслядоўнасць вобразаў кіно. Жанравая паэтыка кіно. Спецыфіка тэатральнай вобразнасці. Прастора сцэны. Сцэна і глядацкая зала. Сцэнічная дзея як адзінства акцёраў, славесных тэкстаў, дэкарацый, рэквізіту, шумавога і светавога афармлення. Акцёр як аснова сцэнічнай дзеі.

Прынцыпы перыядызацыі гісторыі мастацтва і мастацтвазнаўства. Прынцыпы перыядызацыі: па гісторыка-культурных эпохах, гістарычная перыядызацыя гісторыі мастацтваў Макса Дворжака і Ганса Зедльмайра (гісторыя стыляў).

Тыпалогія жанраў мастацтвазнаўчых даследаванняў. Тыпалагічныя разнавіднасці мастацтвазнаўчых даследаванняў: трактат, апісанне, артыкул, рэцэнзія, эсэ, інтэрв'ю, анатацыя, нарыс, манаграфія, альбом мастацкі, нотны зборнік, альманах.

## Раздзел 2. Гісторыя мастацкай крытыкі і мастацтвазнаўства

Вытокі мастацтвазнаўства. Формы і прынцыпы вывучэння мастацтва ў эпоху Антычнасці. Сінкрэтычнасць мастацкіх уяўленняў. Фарміраванне мастацкай тэрміналогіі. Тэарэтычнае асэнсаванне прынцыпаў развіцця мастацтваў у трактатах Піфагора, Платона, Гарацыя, Вітрувія, Цыцэрона і інш. Заснавальнік музыказнаўства Баэцый.

Формы і прынцыпы вывучэння мастацтва ў Сярэднія вякі (Сярэдневякоўе, Адраджэнне). Тэалагічнасць светапогляду ў эпоху Сярэдневякоўя. Тэртуліян і яго праца «Аб відовішчах». Разуменне музыкі як навукі. Гвіда д'Арэца і яго рэформа натацыі. Заснавальнік гісторыі мастацтваў Дж. Вазары. Першыя

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

музычныя слоўнікі. Трактаты Л. да Вінчы, Ч. Чэніні, А. Дзюрэра і інш.

Мастацтвазнаўства Новага часу (XVIII – пачатак XX ст.). Мастацтвазнаўчыя працы ў эпоху Асветніцтва. Працы філосафаў-«энцыклапедыстаў» Д. Дзідро, Ж.-Ж. Русо, нямецкага асветніка Г. Лесінга і інш. Мастацтвазнаўства як навука ў XIX ст. (Г. Вёльфлін).

Савецкае мастацтвазнаўства: асноўная тэматыка даследаванняў і вядучыя прадстаўнікі. Музычна-крытычная і навуковая дзейнасць выдатных прадстаўнікоў савецкага музыказнаўства (Б. Асаф’еў, І. Салярцінскі, С. Скрабкоў, А. Алышванг, Ю. Келдыш, Т. Ліванава і інш.). Навукова-тэарэтычныя працы аб тэатры (К. Станіслаўскі, Г. Баяджыеў, У. Сасноўскі-Панкееў, А. Эфрас і інш.). Тэарэтычныя даследаванні па кінамастацтве (С. Эйзенштэйн, У. Пудоўкін і інш.).

Сучаснае беларускае мастацтвазнаўства: асноўная тэматыка даследаванняў і вядучыя прадстаўнікі. Выданне энцыклапедый, шматтомных гісторый мастацтваў, манаграфій, зборнікаў. Асноўныя даследчыкі і іх працы ў галіне мастацтва.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 3. Гісторыя мастацтва Заходняй Еўропы да XX ст.

Мастацтва эпохі Антычнасці (выяўленчае мастацтва, тэатр, музыка). Асноўныя этапы развіцця грэчаскага мастацтва. Сінтэз архітэктуры і скульптуры. Вазапіс. Культ Дыяніса і яго роля ў паходжанні тэатра. Структура старажытнагрэчаскага тэатра. Асноўныя жанры тэатра: трагедыя, камедыя, сатырычная драма. Музычныя інструменты і зараджэнне тэорыі музыкі. Вытокі рымскай мастацкай культуры. Разнастайнасць тыпаў архітэктуры. Скульптура і жывапіс Старажытнага Рыма. Вытокі рымскага тэатра. Відовішча цырка і амфітэатра. Музыка Старажытнага Рыма: асноўныя жанры, інструменты. Стварэнне вялікіх аркестраў.

Мастацтва эпохі Сярэдневякоўя (выяўленчае мастацтва, тэатр, музыка). Фарміраванне і развіццё раманскага і гатычнага стыляў у сярэдневяковым мастацтве. Асаблівасць скульптуры раманскага і гатычнага стыляў. Вітражы. Творчасць гістрыёнаў. Рэлігійныя жанры тэатра. Свецкая і духоўная музыка Сярэдневякоўя. Прафесійная музычная адукацыя. Грыгарыянскі

харал. Узнікненне лінейнай натацыі, дзейнасць Гвіда д'Арэца. Асаблівасці месы, яе асноўныя гімны і малітвы. З'яўленне шматгалосся, фарміраванне музычных жанраў кандукт і матэт. Фарміраванне рыцарскай культуры. Дзейнасць трубадураў, трувэраў, мінезінгераў.

Мастацтва эпохі Адраджэння (выяўленчае мастацтва, тэатр, музыка). Асноўныя этапы развіцця мастацтва эпохі Адраджэння. Характарыстыка культуры Адраджэння: зварот да антычнай спадчыны; гуманістычная сутнасць і свецкі характар культуры. Майстры Высокага Адраджэння: Леанарда да Вінчы, Рафаэль, Мікеланджэла і месца іх творчасці ў сусветным мастацтве. Асноўныя жанры тэатра: вучоная камедыя, вучоная трагедыя, пастараль. Тэатр і сцэна. Камедыя дэль артэ і яе імправізацыйная аснова, галоўныя персанажы. Развіццё свецкай музыкі. Інструментальная музыка. Асноўныя музычныя інструменты. Разнастайнасць песеннага жанру. Росквіт скрыпічнага мастацтва: творчасць Амаці, Страдывары, Гварнеры. Творчасць Дж. Палестрыны.

Мастацтва эпохі Паўночнага Адраджэння. Асаблівасць Паўночнага Адраджэння. Адраджэнне ў Нідэрландах. Творчасць братоў Ван Эйкаў, І. Босха, П. Брэйгеля-Мужыцкага. Адраджэнне ў Германіі: А. Дзюрэр, Ганс Гальбейн. Адраджэнне ў Францыі: Ж. Фукэ, Ф. Клуэ, Ж. Клуэ Малодшы. Развіццё англійскага гуманістычнага тэатра. «Універсітэцкія розумы»: Дж. Ліпі, К. Марло, Р. Грын. Сцэна, акцёры. Творчасць В. Шэкспіра. Стварэнне поліфанічнай школы ў Нідэрландах: Г. Дзюфаі, Ж. Дэпрэ. Творчасць А. Ласа. Фарміраванне пратэстанцкага харала ў Германіі. Ганс Сакс: яго музычная і тэатральная дзейнасць.

Стыль барока ў мастацтве Заходняй Еўропы. Характэрныя рысы барока. Вядучая роля архітэктуры, новыя прынцыпы планіроўкі гарадоў. Характар сінтэзу мастацтваў. Творчасць Мікеланджэла да Караваджа. Караваджызм – кірунак у мастацтве. Фарміраванне новых жанраў музычнай культуры: опера, араторыя, кантата, сімфонія, канцэрт. Творчасць Г. Ф. Гендэля, І. С. Баха як яскравых прадстаўнікоў стылю барока. Распаўсюджванне стылю барока ў Фландрыі. Творчасць П. П. Рубенса.

Стыль класіцызму ў выяўленчым і тэатральным мастацтве Заходняй Еўропы. Фарміраванне стылю класіцызму, яго асноў-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ныя прынцыпы. Каралеўскія дварцы і паркі: Версаль і Луўр. Творчасць Ленотра, Лево, Леблена, К. Перо і інш. Асаблівасці класіцызму ў жывапісе. Творчасць Н. Пусэна і К. Ларэна, бытавы жанр братоў Лененаў. Н. Буало – тэарэтык класіцызму. Творчасць П. Карнэля і Ж. Расіна. Ж. Б. Паклен (Мальер) – вялікі камедыянт і камедыёграф. Прыёмы акцёрскай ігры тэатра класіцызму.

Рамантызм у заходнееўрапейскім музычным мастацтве. Рамантызм як ідэйна-мастацкі кірунак у музычнай культуры Заходняй Еўропы XIX ст. : перыядызацыя, прадстаўнікі, асноўныя тэмы і жанры. Характэрныя рысы рамантычнага мастацтва: увага да эмацыянальнага свету асобы. Развіццё гарадской культуры, узнікненне новых музычных тэатраў, асветніцкіх арганізацый. Новыя жанры музычнага мастацтва. Станаўленне выканальніцтва як самастойнага віду музычнай прафесійнай дзейнасці. Сувязь музыкі і філасофіі, музыкі і жывапісу, музыкі і літаратуры.

Рэалізм у выяўленчым і тэатральным мастацтве Заходняй Еўропы. Асноўныя прынцыпы рэалізму. Французскі рэалізм: Г. Курбэ, Ж. Ф. Міле, Ж. Каро. Натуралізм і крытычны рэалізм у тэатральным мастацтве. Асаблівасці акцёрскага майстэрства рэалістычнага кірунку. «Картэль чатырох».

Імпрэсіянізм у традыцыйных мастацтвах XIX–XX стст. Творчасць мастакоў-імпрэсіяністаў (К. Манэ, К. Пісаро, Э. Дэга, А. Рэнуар, Э. Манэ і інш.). Імпрэсіянізм у творчасці К. Дэбюсі і М. Равеля. Імпрэсіянізм у французскім музычным мастацтве канца XIX – пачатку XX ст. Музычная культура Францыі канца XIX – пачатку XX ст. Імпрэсіянізм у музыцы. Творчасць К. Дэбюсі, М. Равеля.

## Раздзел 4. Гісторыя мастацтва Расіі і Беларусі да XX ст.

Выяўленчае мастацтва і архітэктура Старажытнай Русі. Самабытная мастацкая культура ўсходніх славян. Значэнне сувязей з Візантыяй. Мастацтва Кіеўскай Русі. Мазаікі і фрэскі Сафійскага сабора ў Кіеве. Узнікненне мясцовых мастацкіх школ. Мастацтва Ноўгарада і Уладзіміра-Суздальскага княства. Мастацтва Маскоўскай дзяржавы. Іканапіс. Парсуна.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Старажытнаруская музычная культура. Вытокі рускай музыкі і асноўныя этапы яе развіцця. Руская музычная культура эпохі Сярэдневякоўя (IX – пачатак XVII ст.). Культура Кіеўскай Русі (IX–XIII стст.): агульная характарыстыка, сярэдневяковая музычна-спеўная культура, цэнтры музычна-спеўнай культуры, музычная адукацыя, пеўчыя стылі і жанры, натацыя, спеўнікі. Знаменны распеў. Культура Уладзімірскага і Маскоўскага княстваў (XIV–XVI стст.): развіццё знаменнага распеву. Першыя прафесійныя музычныя калектывы.

Стыль барока ў рускай музычнай культуры. Руская музычная культура эпохі барока (XVII ст.): агульная характарыстыка, асноўныя тэндэнцыі развіцця. Узнікненне і асаблівасці развіцця партэснага (шматгалосага) стылю спеваў. Вядучыя майстры рускага партэснага спеву: В. Цітоў, М. Калашнікаў, Ст. Бяляеў, М. Бавыкін. Развіццё свецкай музыкі. Народная культура.

Стыль класіцызму ў рускай музычнай культуры. Агульная характарыстыка рускай музычнай культуры XVIII ст. Дзейнасць Пятра I. Станаўленне камічнай оперы на рускай сцэне. Развіццё жанру канта: гістарычны, навігацыйны, апісальны, духоўны. Дзейнасць Кацярыны II. Станаўленне рускай нацыянальнай оперы: творчасць В. Лашкевіча, Е. Фаміна, М. Сакалоўскага. Жыццёвы і творчы шлях М. Беразоўскага і М. Бартнянскага. Рамантызм у рускім музычным мастацтве. Нацыянальная рамантыка ў беларускай музыцы.

Іканапіс Беларусі XIV–XVIII стст. Уплыў візантыйскіх традыцый на беларускі іканапіс. Фарміраванне самабытнай нацыянальнай іканапіснай школы («Маці Боская Замілаванне», «Адзігітрыя Іерусалімская», «Раство Маці Боскай», «Параскева Пятніца» і інш.). Характэрныя рысы беларускай іканапіснай школы: простанародны тыпаж, мажорны настрой, архітэктурны і пейзажны фоны, упрыгожванне.

Стыль барока ў архітэктуры і выяўленчым мастацтве Беларусі. Асноўныя этапы стылю барока ў Беларусі. Архітэктура барока, асаблівасці «віленскага» барока. Праяўленне барока ў манументальна-дэкаратыўным мастацтве, іканапісе, свецкім жывапісе. «Сармацкі» партрэт і яго самабытныя рысы. Уплыў барока на пашырэнне сістэмы жанраў у мастацтве графікі.

Тэатральнае мастацтва ў Беларусі XVII–XVIII стст. Фарміраванне школьнага тэатра на тэрыторыі Беларусі. Сюжэты

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

школьных драм. Жанравая разнастайнасць рэпертуару: трагедыі, камедыі, трагікамедыі, літургічныя драмы, інсцэніроўкі, дыялогі. Інтэрмедыі: камедыйны, фарсавы, лубочны характар прадстаўленняў. Батлейка – беларускі народны лялечны тэатр. Народная драма як вышэйшая форма народнага тэатра. Прыватнаўласніцкі, магнацкі тэатр на тэрыторыі Беларусі. Тэатр Радзівілаў у Нясвіжы і Слуцку. Драматургічная і тэатральная дзейнасць У. Ф. Радзівіл. Тэатр Тызенгаўза ў Гродне, М. К. Агінскага ў Слоніме, С. Зорыча ў Шклове, Сапегаў у Ружанах.

Рэалізм у беларускім выяўленчым мастацтве. Уплыў ідэй «перасоўнікаў» на творчасць беларускіх мастакоў. Работы І. Я. Рэпіна ў Здраўнева і іх уплыў на беларускае мастацтва. Рэалістычныя прынцыпы паказу рэчаіснасці: творчасць Д. Баркоўскага, Ф. Гарэцкага, А. Гараўскага, Б. Русецкага. Скульптура К. Ельскага.

Руская музычная культура першай паловы XIX ст.: жанры, тэмы, стылявыя тэндэнцыі. Жыццёвы і творчы шлях М. Глінкі. Творчая спадчына кампазітара. Глінка і яго роля ў развіцці рускай оперы. Рускае музычнае мастацтва другой паловы XIX ст.: «Магутная кучка», творчасць П. Чайкоўскага. Оперная творчасць (агульная характарыстыка).

Рэалізм у рускім выяўленчым і тэатральным мастацтве. Асаблівасці фарміравання рэалізму ў рускім мастацтве. Таварыства перасоўных мастацкіх выстаў. Жанравы і гістарычны жывапіс перасоўнікаў. Творчасць В. М. Васняцова. Пейзажны жывапіс. Творчасць І. Я. Рэпіна і В. І. Сурыкава як вяршыня творчасці перасоўнікаў. «Сцэнічны рэалізм»: драматургія А. Астроўскага, А. Чэхава, Л. Таўстога, М. Горкага і інш. Сцэнічнае мастацтва М. Ярмолавай, П. Садоўскага, М. Савінай, В. Камісаржэўскай.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Раздзел 5. Гісторыя мастацтва Заходняй Еўропы XX ст.

Кірунак сімвалізму ў мастацтве XIX–XX стст. Сімвалізм у выяўленчым мастацтве Заходняй Еўропы (Г. Маро, П. П. дэ Шаван, П. Гаген і «Набі» і інш.). Драматургія сімвалізму. Творчасць Г. Крэга, «Трагічны тэатр» У. Б. Ейтса. Дзейнасць мастацкага аб’яднання «Свет мастацтва». Сцэнічныя эксперыменты У. Э. Меерхольда.

Экспрэсіянізм у тэатры і выяўленчым мастацтве. Дзейнасць мастацкіх аб'яднанняў «Мост» (Э.-Л. Кірхнер, Э. Хекель, Э. Нальдэ і інш.), «Блакітны вершнік» (В. Кандзінскі, Ф. Марк, А. Яўленскі). Пасляваенны экспрэсіянізм: О. Дыкс, Г. Грос, О. Каюшка. Драматургія экспрэсіянізму. Сцэнічныя пошукі Г. Хартунга, М. Рэйнхарта, Л. Еснера, Ю. Фелінга.

Экспрэсіянізм у музычным мастацтве. Экспрэсіянізм у музычнай культуры Аўстрыі і Германіі. Творчасць кампазітараў нававенскай школы (А. Шонберг, А. Берг, А. Вэбэрн). Творчасць Г. Малера. Музычная культура першай паловы ХХ ст.: мадэрнізм, авангард.

Кірунак сюррэалізму ў мастацкай культуры ХХ ст. Біяморфны сюррэалізм як паслядоўнае выконванне прынцыпаў аўтаматычнага пісьма (Х. Міро, А. Масон, Р. Мата). Натуралістычны сюррэалізм і візуалізацыя палажэнняў псіхааналізу (С. Далі, П. Дэлью, Р. Магрыт). Сюррэалізм у творчасці Ж. Както. Тэатральная канцэпцыя і драматургія І. Голя. Тэатр «Альфрэд Жары» і сюррэалістычны перыяд у творчасці А. Арто.

Авангардызм у музычным мастацтве: этапы, прадстаўнікі, характэрныя рысы авангарднага мастацтва. Творчасць кампазітараў французскай «шасцёркі» (А. Анэгер, Д. Міё, Ф. Пуленк, Л. Дзюрэй, Ж. Тайф, Ж. Арык). Творчасць А. Месіяна.

Канцэптуалізм у мастацкай культуры ХХ ст. Вывучэнне камунікатыўных сродкаў і знакавых сістэм. Група «Мастацтва-мова», творчасць Дж. Кошута, А. Берна, Д. Хьюблера. Савецкі канцэптуалізм.

Кінамастацтва Францыі. Асноўныя мастацкія плыні і вядучыя майстры. Станаўленне кіно: фільмы-рэпартажы братоў Люм'ер і фільмы-феерыі Ж. Мельеса. Французскі кінаімпрэсіянізм. Французскі кінаавангард. Французскі паэтычны рэалізм Ж. Віго, М. Карнэ. Феномен «новай хвалі» ў французскім кіно.

Кінамастацтва Германіі. Асноўныя мастацкія плыні і вядучыя майстры. Станаўленне кінашколы Германіі пасля Першай сусветнай вайны. Фільмы Э. Любіча. Нямецкі кінаэкспрэсіянізм. Творчасць Ф. Ланга. «Новая хваля» ў кіно Германіі. Кінапаэтыка В. Вендэрса.

Кінамастацтва Швецыі. Асноўныя мастацкія плыні і вядучыя майстры. Станаўленне шведскай кінашколы: творчасць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

В. Шострама і М. Шцілера. Плыня фюрціяталізму ў шведскім кіно. Кінапаэтыка І. Бергмана.

Кінамастацтва Італіі. Асноўныя мастацкія плыні і вядучыя майстры. Італьянскі неарэалізм. Экзістэнцыяльны рэалізм М. Антаніёні. Творчасць Л. Вісконці і Ф. Феліні.

Кінамастацтва Вялікабрытаніі другой паловы XX ст. Характэрныя рысы англійскай кінашколы. Група «Вольнае кіно». «Маладыя раз'юшаныя». Творчасць П. Грынуэя.

Кінамастацтва Польшчы другой паловы XX ст. «Польская школа фільмовая» і творчасць А. Вайды. Феномен «кіно разліку». «Кіно маральнага неспакою» (К. Занусі, К. Кесьлёўскі).

Кінамастацтва Іспаніі другой паловы XX ст. Франкісцкі перыяд іспанскага кіно. «Новая хваля» і творчасць К. Сауры. Феномен «генерацыі бязвінных». Творчасць Л. Бунюэля.

Экраннае мастацтва ў эпоху постмадэрнізму. Постмадэрнісцкая стылістыка кінатвораў (травесціраванне, інтэртэкстуалізацыя, двукодавасць). Творчасць Э. Кустурыцы, Д. Джармуша, П. Альмадовара, Вонга Кар-Вая.

### Раздзел 6. Гісторыя мастацтва Расіі і Беларусі XX ст.

Савецкае кінамастацтва першай паловы XX ст. Маскоўская школа (С. Эйзенштэйн, Л. Куляшоў, У. Пудоўкін) і ФЭКС (Г. Козінцаў, Л. Траўберг, С. Юткевіч). Змена стылістыкі савецкага кіно на мяжы 1950–1960-х гг. Паэтыка-дакументальная і паэтыка-жывапісная плыні. Феномен «кіно на паліцы». Творчасць А. Таркоўскага.

Сацыялістычны рэалізм у мастацкай культуры XX ст. Сталінскі ампір і таталітарнае мастацтва. «Тэорыя бесканфліктнасці» ў пасляваенным мастацтве. Перыяд «адлігі», стылявы плюралізм мастацкіх пошукаў 1970–1980-х гг. Феномен мастацкага андэграўнда.

Неакласіцызм у рускай музыцы. Неафальклярызм. Новыя кірункі ў заходнееўрапейскім музычным мастацтве. Неакласіцызм (Ф. Бузоні, М. Равель, П. Хіндэміт, І. Стравінскі, Э. Віла-Лобас). Неарамантызм (І. Стравінскі, Б. Бартак, М. дэ Фалья). Нэарамантызм (Р. Штраус, Г. Малер).

Музычная культура другой паловы XX ст.: авангард. Новая фальклорная хваля ў рускай музычнай культуры. Рускі аван-

РЭПАЗІТОРЫЙ БГУКІ

гард. Творчасць С. Губайдулінай, Э. Дзянісава. Сучасныя расійскія кампазітары: Я. Дога, Г. Гладкоў, А. Рыбнікаў, А. Пятроў, А. Зацэпін, Э. Арцем’еў, У. Шаінскі і інш.

Кінамастацтва Беларусі: стылявыя напрамкі, вядучыя майстры. Кіно Беларусі 1920–1930-х гг. і творчасць Ю. Тарыча. «Новая хваля» ў беларускім кіно (В. Тураў, І. Дабралюбаў). Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў беларускім кіно. Экранізацыя класічнай беларускай літаратуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура


*Асноўная*

1. *Агафонова*, *Н. А.* Искусство кино: этапы, стили, мастер : пособие для студентов вузов / Н. А. Агафонова. – Минск : Тесей, 2005. – 192 с.
2. *Агафонова, Н. А.* Общая теория кино и основы анализа фильма / Н. А. Агафонова. – Минск : Тесей, 2008. – 390 с.
3. *Агафонова, Н. А.* Экранное искусство: художественная и коммуникативная специфика / Н. А. Агафонова; М-во культуры Респ. Беларусь, Белорус. гос. ун-т культуры и искусств. – Минск : БГУ культуры и искусств, 2009. – 273 с.
4. *Асеев, Б. Н.* Русский драматический театр от его истоков до конца XVIII века : учебник для театр. ин-тов / Б. Н. Асеев. – 2-е изд., перераб. и доп. – М. : Искусство, 1987. – 576 с.
5. *Герчук, Ю. Я.* Основы художественной грамоты: Язык и смысл изобразительного искусства : учеб. пособие / Ю. Я. Герчук. – М. : Учебная литература, 1998. – 204 с.
6. *Егоров, В. В.* Телевидение: страницы истории / В. В. Егоров. – М. : Аспект-пресс, 2004. – 202 с.
7. *Ильина, Т. В.* Введение в искусствознание : учеб. пособие для студентов вузов / Т. В. Ильина. – М. : АСТ : Астрель, 2003. – 207 с.
8. *Кон-Винер, Э.* История стилей изобразительных искусств : пер. с нем. / Э. Кон-Винер. – М. : ЗАО «Сварог и К»,1998. – 217 с.
9. *Пракапцова, В. П.* Спасціжэнне майстэрства / В. П. Пракапцова. – Мінск : МФКД, 2006. – 206 с.

*Дадатковая*

1. *Андреева, Е. А.* Постмодернизм: Искусство второй половины XX – начала XXI века / Е. А. Андреева. – СПб. : Азбука-классика, 2007. – 488 с.
2. Аполлон. Изобразительное и декоративное искусство. Архитектура : терминолог. слов. / под общ. ред. А. М. Кантора. – М. : Эллис Лак, 1997. – 736 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*3.* Балет : энцикл. / гл. ред. Ю. Н. Григорович. – М. : Сов. энцикл., 1981. – 621 с.

*4.* Беларусы. Т. 11. Музыка / Т. Б. Варфаламеева [і інш.] ; рэдкал.: М. Ф. Піліпенка (старш.) [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Беларус. навука, 2008. – 700 с.

*5.* Беларусы. Т. 12. Экраннае мастацтва / А. В. Красінскі [і інш.] ; рэдкал.: А. В. Красінскі [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2009. – 687 с.

*6.* Беларусы. Т. 13. Тэатральнае мастацтва / Р. Б. Смольскі [і інш.] ; рэдкал.: В. М. Ярмалінская [і інш.]. – Мінск : Беларус. навука, 2012. – 758 с.

*7.* Взаимодействие и синтез искусств: сб. / АН СССР, Науч. совет по истории мировой культуры, Комис. комплекс. изуч. худож. творчества; редкол.: Д. Д. Благой [и др.]. – Л. : Наука, 1978. – 269 с.

*8.* Гісторыя кінамастацтва Беларусі: у 4 т. – Мінск : Беларус. навука, 2001–2004. – 4 т.

*9. Дмитриева, Н. А.* Краткая история искусств / Н. А. Дмитриева. – М. : АСТ-ПРЕСС: Галарт, 2000. – 624 с.

*10. Ильина, Т. В.* История искусств. Западноевропейское искусство : учебник для вузов / Т. В. Ильина ; ред. С. А. Юшина. – 3-е изд., перераб. и доп. – М. : Высш. шк., 2000. – 368 с.

*11. Ильина, Т. В.* История искусств. Отечественное искусство : учебник для вузов / Т. В. Ильина. – 3-е изд., перераб. и доп. – М. : Высш. шк., 2003. – 407 с.

*12. Ильина, Т. В.* История искусств: Русское и советское искусство : учебник для вузов / Т. В. Ильина. – М. : Высш. шк., 1989. – 400 с.

*13.* История европейского искусствознания: от античности до конца XVIII в. / отв. ред. Б. Р. Виппер, Т. Н. Ливанова. – М. : Изд-во Академии наук СССР, 1963. – 436 с.

*14.* История зарубежной музыки XX в. / отв. ред. Н. Гаврилова. – М. : Музыка, 2007. – 576 с.

*15.* История русской музыки : в 10 т. / Всесоюзный науч.-исслед. ин-т искусствознания М-ва культуры СССР ; редкол.: Ю. В. Келдыш [и др.]. – М. : Музыка, 1985–1994. – 10 т.

*16. Ливанова, Т. Н.* Западноевропейская музыка XVII–XVIII веков в ряду искусств / Т. Н. Ливанова. – М. : Музыка, 1977. – 528 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*17. Ливанова, Т. Н.* История западноевропейской музыки до 1789 года : учебник / Т. Н. Ливанова. – М. : Музыка, 1983. – 454 с.

*18. Лотман, Ю. М.* Статьи по семиотике культуры и искусства / Ю. М. Лотман ; сост. Р. Г. Григорьев. – СПб. : Акад. проект, 2002. – 543 с. – (Мир искусства).

*19. Пави, П.* Словарь театра : пер. с фр. / П. Пави. – М. : Прогресс, 1991. – 504 с.

*20.* Прафесійнае музычнае мастацтва // Беларусы : у 12 т. / Нац. акад. навук Беларусі, Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К. Крапівы, рэдкал. : М. Ф. Піліпенка [і інш.] ; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск, 2006–2009. – Т. 11 : Музыка / Т. Б. Варфаламеева [і інш.]. – Мінск, 2008. – С. 332–697.

*21.* Тэатральная Беларусь : энцыкл. : у 2 т. / пад агул. рэд. А. В. Сабалеўскага. – Мінск : Беларус. энцыкл., 2002. – 2 т.

*22. Шестаков, В. П.* От этоса к аффекту. История музыкальной эстетики от античности до XVIII века / В. П. Шестаков. – М. : Музыка, 1975. – 351 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

# ТЭОРЫЯ І ГІСТОРЫЯ МАСТАЦТВАЎ

*Праграма дзяржаўнага экзамену*
*па спецыяльнасці 1-21 04 02 Мастацтвазнаўства (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці 1-21 04 02-05 Мастацтвазнаўства*
*(інтэграванае), спецыялізацыі 1-21 04 02-05 01*
*Кампаратыўнае мастацтвазнаўства*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар А. У. Гіцкая

Падпісана ў друк 2018. Фармат 60x84 $^1/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 1,22. Ул.-выд. арк. 0,82. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ